**Д. І. Прыгодзіч**

Музей гісторыі БДУ, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, Беларусь

УДК 069 (476)

# ГІСТОРЫЯ ФАРМІРАВАННЯ МУЗЕЯЎ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ БЕЛАРУСІ

У артыкуле даецца кароткі агляд гісторыі ўзнікнення і развіцця музеяў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Ва ўніверсітэцкіх музеях засяроджана гісторыка-культурная і прыродная спадчына, прадстаўлена гісторыя навуковых напрамкаў, навучальных устаноў і іх падраздзяленняў. На сучасным этапе працягваюць развівацца старыя музеі і ствараюцца новыя; яны з'яўляюцца базай для бесперапыннага навучання студэнтаў ВНУ.

**Ключавыя словы:** навучальна-дапаможны кабінет, музей, вышэйшая навучальная ўстанова, музейная сетка, музейны прадмет, калекцыя, фонд, экспазіцыя.

**Узор цытавання:** *Прыгодзіч Д. І.* Гісторыя фарміравання музеяў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі // София: электрон. науч.-просветит. журн. 2021. № 1. С. 62–66.

**D. Pryhodzich**

The Museum of history of BSU, Belarusian State University, Minsk, Belarus

# HISTORY OF THE FORMATION OF MUSEUMS OF HIGHER EDUCATIONAL INSTITUTIONS OF BELARUS

The article provides a brief overview of the history of the emergence and development of museums of higher educational institutions of Belarus. Historical, cultural, and natural heritage is concentrated in the university museums, the history of scientific fields, educational institutions and their divisions is presented. At the present stage, old museums continue to develop, and new museums are being created, which are the basis for the continuous education of applicants and graduates.



**Keywords:** educational auxiliary office, museum, university, museum network, museum object, collection, fund, exposition.

**For citation:** Pryhodzich, D. (2021). History of the formation of museums of higher educational institutions of Belarus. *Sophia*, 1, 62–66 (in Belar.).

**Аўтар:**
**Дар'я Ігараўна Прыгодзіч** – магістр гуманітарных навук, супрацоўнік музея гісторыі БДУ.
*pryhodzich@bsu.by*

**Author:**
**Darya Pryhodzich** – MA, employee of the Museum of History of BSU.

Станаўленне музейнай справы ў вышэйшай школе Беларусі пачыналася са стварэння музеяў пры першых вышэйшых навучальных установах. Дадзеныя музеі ўзнікалі як пры навучальных кабінетах, так і на агульнаўніверсітэцкім узроўні для збору, навуковай апрацоўкі і дэманстрацыі матэрыялаў па гісторыі краю і яго прыродных рэсурсаў. Першыя музеі сталі фарміравацца адначасова са стварэннем саміх ВНУ з ахвяраванняў мецэнатаў, збораў навукоўцаў, закупак і перадачы калекцый і матэрыялаў з іншых музейных збораў.

У аснову музея старажытнасцей Віленскага ўніверсітэта, адкрытага ў 1856 г., лёг прыватны збор братоў Тышкевічаў: археалагічная калекцыя, карціны, антыкварыят,

абразы, крыжы, кнігі і інш. У 1775 г. у Гродне была адкрыта Медыцынская акадэмія, пры якой меўся «музей для вывучэння натуральнай гісторыі», у залах якога размяшчаліся астранамічныя, фізічныя, механічныя вынаходкі, прадметы побыту і інш. У 1781 г. акадэмія была рэарганізавана ў факультэт Віленскага ўніверсітэта, які праіснаваў да паўстання 1830–31 гг. Яшчэ адзін музей дзейнічаў пры Полацкай езуіцкай акадэміі, адкрытай у 1812 г. Музей складаўся з карціннай галерэі, фізічнага, прыродазнаўчага, астранамічнага і хімічнага кабінетаў. Славутасцю музея была механічная галава, якая мела рухомыя вочы і адказвала наведвальнікам на розных еўрапейскіх мовах. У 1820 г. акадэмія была зачынена. Вялікай папулярнасцю карыстаўся музей Горы-Горацкага сельскагаспадарчага інстытута, які меў «багатую калекцыю ўсяго, што мае дачыненне да сельскай гаспадаркі і сумежных з ёй галін вытворчасці, а таксама натуральных навук» [1, с. 52]. Пасля паўстання К. Каліноўскага (1863–64) і інстытут, і музей спыняюць сваю дзейнасць. З закрыццём інстытута заканчваецца **першы этап** у зараджэнні і фарміраванні музеяў вышэйшай школы Беларусі.

**Другі этап** пачынаецца пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, калі ў сістэме вышэйшай школы БССР адбыліся глабальныя трансфармацыйныя працэсы. ВНУ ствараліся і дзейнічалі як цэнтры адукацыі, навукі, асветы і культуры нацыянальнага значэння, іх галоўнай мэтай была падрыхтоўка навукова-педагагічнай і культурнай эліты. Пачынаючы з 1919 г. дзейнасць як саміх навучальных устаноў, так і музеяў ВНУ рэгулявалася рашэннямі Народных камісарыятаў асветы СССР і БССР. Быў вызначаны статус дадзеных музеяў як самастойных «устаноў з усімі, уласцівымі музею асаблівасцямі», але «круг тэматыкі, асноўная экспанатура і форма працы такога музея павінны быць абумоўлены напрамкамі дзейнасці навучальнай установы» [17, с. 199].

Неабходнасць у наглядных навучальных матэрыялах з'яўлялася галоўным стымулам для стварэння ўніверсітэцкіх музеяў, якія выкарыстоўваліся пры выкладанні шэрага вучэбных дысцыплін, а таксама ў вырашэнні задач народнай асветы і пашырэння камуністычнай ідэалогіі. У адпаведнасці з новым падыходам да сістэмы выкладання па-іншаму былі арганізаваны заняткі па дысцыплінах – яны сталі праходзіць пад строгім кантролем выкладчыкаў у спецыяльна абсталяваных памяшканнях: кабінетах, лабараторыях, музеях.

У 1919 г. сваю дзейнасць аднаўляе Земляробчы інстытут у Горках, пры якім былі створаны розныя вучэбна-дапаможныя ўстановы: заалагічны музей, кабінеты жывёлагадоўлі, батанікі, мінералогіі і геалогіі, кабінет культур-тэхнікі, машынны музей і інш. [14]. У Беларускім політэхнічным інстытуце дзейнічалі фізічны, геадэзічны, інжынерна-будаўнічы, лясны, батанічны, заалагічны, мінералагічны, электратэхнічны кабінеты, музей сельскагаспадарчых прылад, якія знаёмілі наведвальнікаў з вынікамі вывучэння мясцовай прыроды і сельскай гаспадаркі рэспублікі [3, с. 469].

Пасля адкрыцця ў Мінску ў 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта аднымі з яго першых музеяў сталі лабараторыі, арганізаваныя пры медыцынскім факультэце. У 1920-я гг. былі адкрыты анатамічны музей, музей судовай медыцыны, музей клінікі хвароб вуха, горла, носа [13]. У 1930 г. медыцынскі факультэт БДУ быў рэарганізаваны ў Мінскі медыцынскі інстытут, пры якім працягнулі сваю дзейнасць і названыя музеі. У пачатку 1920-х гг. на медыцынскім і педагагічным факультэтах БДУ быў адкрыты заалагічны музей, створаны кабінет мінералогіі і крышталяграфіі, які ў 1934 г. быў рэарганізаваны ў музей мінералогіі і петраграфіі. У 1924 г. пры педагагічным факультэце і факультэце грамадскіх навук пачаў сваю дзейнасць музей

першабытнай культуры і рэлігіі, у 1926 г. ён быў перайменаваны ў музей гісторыі рэлігіі і атэізму [2; 9; 10].

Пры Віцебскім вышэйшым педагагічным інстытуце быў адкрыты этнографа-археалагічны музей [5, с. 4]. Адразу пасля адкрыцця ў 1924 г. Віцебскага ветэрынарнага інстытута ў ім быў створаны шэраг музеяў [7]: энтамалагічны і заалагічны, анатамічны, паталагаанатамічны, паразіталагічны, музей паталогіі мяса і мясапрадуктаў, рыбы, малочных вырабаў, тлушчу, прадуктаў расліннага паходжання. У 1938 г. пры Інстытуце фізічнай культуры ў Мінску адкрыўся музей лыж [11, с. 4].

З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны навуковымі работнікамі, студэнтамі, рабочымі і служачымі ВНУ БССР была эвакуявана частка каштоўнага абсталявання музеяў, кабінетаў, кафедраў. Аднак большая частка экспанатаў падчас вайны была страчана.

**Трэці этап** у гісторыі фарміравання і дзейнасці музеяў вышэйшай школы БССР прыпадае на пасляваенны перыяд, калі музеі прайшлі працэс ад аднаўлення сваёй дзейнасці да актыўнага ўдзелу ў навуковых і экспедыцыйных даследаваннях, папаўнення фондаў, увядзення музеяў у навуковую працу вышэйшай школы.

У 1968 г. быў створаны навукова-метадычны савет па працы музеяў вышэйшай школы пры Міністэрстве вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, які каардынаваў дзейнасць музеяў. Былі арганізаваны музеі рознага падпарадкавання з рознай спецыялізацыяй: натуральна-гістарычныя, гістарычныя, літаратурныя, мемарыяльныя, мастацкія і інш. Пры Гомельскім педагагічным інстытуце імя У. І. Чкалава былі адкрыты музей-лабараторыя «Прырода Беларусі» (1949), геалагічны музей (1969), археалагічны музей-лабараторыя (1980); пры Віцебскім медыцынскім інстытуце – музей кафедры медыцынскай біялогіі (1960-я гг.); пры Віцебскім педагагічным інстытуце імя С. М. Кірава – біялагічны музей (1975), літаратурны музей (1980), мемарыяльны кабінет-музей П. М. Машэрава (1983), музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (1986); пры Віцебскім ветэрынарным інстытуце – музей тапанімічнай анатоміі (1983); пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна – музей юрыдычнага факультэта (1986) і інш. [6–8; 12].

Многія ВНУ стварылі музеі гісторыі сваёй установы. У 1960–80-я гг. адкрываюцца музеі гісторыі Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, Магілёўскага педагагічнага інстытута, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга Інстытута фізічнай культуры, Віцебскага ветэрынарнага і Віцебскага медыцынскага інстытутаў, Віцебскага педагагічнага інстытута імя С. М. Кірава, Беларускага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту і інш.

У 1984 г. было распрацавана і зацверджана «Тыпавое палажэнне аб музеі вышэйшай навучальнай установы» [15], узгодненае з Міністэрствам культуры БССР. У адпаведнасці з «Палажэннем» музей з'яўляўся ідэалагічным, вучэбна-навуковым, навукова-асветніцкім падраздзяленнем ВНУ і дзяржаўным сховішчам помнікаў гісторыі, натуральнай гісторыі, матэрыяльнай і духоўнай культуры. У «Палажэнні» кожнага музея вышэйшай навучальнай установы адзначалася, што ён з'яўляецца вучэбным, навуковым, асветніцкім падраздзяленнем ВНУ, асноўная задача якога – удзел у падрыхтоўцы кваліфікаваных спецыялістаў і ўдасканаленне форм і метадаў вучэбнай і навукова-асветніцкай працы.

У 1990-я гг. пачынаецца **чацвёрты этап** у гісторыі фарміравання музеяў вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, якія ва ўмовах абвастрэння эканамічнага крызісу і скарачэння фінансавання вышэйшай школы губляюць свой статус. Аднак з канца

XX ст. яны ізноў становяцца запатрабаванымі інстытутамі сацыяльнай памяці і цэнтрамі навуковых даследаванняў, іх колькасць з кожным годам павялічваецца. У 2020–21 навучальным годзе на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь дзейнічала 50 вышэйшых навучальных устаноў [16], у структуры якіх, нягледзячы на шматлікія праблемы (умовы ўтрымання музеяў і калекцый, забеспячэнне фінансавай устойлівасці, бяспекі, належнага ўліку і захаванасці, выкарыстанне маркетынгавых інструментаў для прыцягнення публікі ў музей, развіццё міжнародных партнёрскіх сувязяў, выкарыстанне лічбавых тэхналогій, сацыяльных медыя для развіцця супрацоўніцтва і павышэння прывабнасці музея [4], а праз яго і вышэйшай навучальнай установы) прадстаўлены ад аднаго да некалькіх музеяў, некаторыя з якіх знаходзяцца на стадыі стварэння.

Неабходнасць трансфармацыі ўніверсітэцкіх музеяў на сучасным этапе з'яўляецца актуальнай і абумоўлена ўзрастаннем патрабаванняў да вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, якія павінны павышаць якасць адукацыі, узровень кваліфікацыі супрацоўнікаў і выпускнікоў, быць даступнымі для мясцовай супольнасці, прыцягваць дадатковыя фінансавыя рэсурсы для рэалізацыі праграм і міжнароднай дзейнасці. У пачатку XXI ст. узнік Камітэт універсітэцкіх музеяў і калекцый (UMAC) пры Міжнародным савеце музеяў (ICOM) [18], а таксама Еўразійская асацыяцыя ўніверсітэцкіх музеяў краін СНД. Адным з напрамкаў даследаванняў гэтых арганізацый з'яўляецца гісторыя музеяў вышэйшых навучальных устаноў, якая дазваляе лепш зразумець іх сучасны стан і перспектывы развіцця. UMAC падтрымлівае пастаяннае развіццё ўніверсітэцкіх музеяў і калекцый як найважнейшых рэсурсаў, прысвечаных адукацыі, даследаванням і захаванню культурнай, гістарычнай, прыроднай і навуковай спадчыны.

Такім чынам, музеі вышэйшых навучальных устаноў Беларусі, пераадолеўшы доўгі шлях у сваім развіцці, з навучальных, даследчых кабінетаў былі рэарганізаваны ў самастойныя структурныя падраздзяленні, якія за гісторыю свайго існавання сфарміравалі ўнікальны музейны фонд і назапасілі бясцэнны вопыт захавання і папулярызацыі гісторыка-культурнай і прыроднай спадчыны, а таксама сталі транслятарамі дзяржаўнай палітыкі ў сферы вышэйшай адукацыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Гужалоўскі, А. А.* Нараджэнне беларускага музея / А. А. Гужалоўскі. – Мінск: НАРБ, 2001. – 124 с.

2. Заалагічны музей // Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://bsu.by/structure/faculties/kafedry/zoologicheskiy-muzey-d. – Дата доступу: 11.02.2021.

3. Запіскі Беларускага дзяржаўнага інстытута сельскай гаспадаркі ў памяць Кастрычніцкай рэвалюцыі. – Вып. 1. – Мінск, 1923.

4. *Литвина, Л.* Университетские музеи за рубежом – прошлое и настоящее / Л. Литвина // Обсерватория культуры: журнал-обозрение. – 2005. – № 2. – С. 71–77.

5. *Малешка, М.* Віцебскі Вышэйшы Педагагічны Інстытут / М. Малешка // Савецкая Беларусь. – 1924. – № 24 (24 лют.). – С. 4.

6. Музеі // Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://vsu.by/musei.html. – Дата доступу: 11.01.2021.

7. Музеі // УА «Віцебская ордэна „Знак Пашаны" дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.vsavm.by/muzei/. – Дата доступу: 12.01.2021.

8. Музеі ўніверсітэта // Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.gsu.by/ru/university-museums. – Дата доступу: 12.01.2021.

9. Музей гістарычнага факультэта // Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://bsu.by/structure/faculties/kafedry/laboratoriya-muzeynogo-dela-d. – Дата доступу: 11.02.2021.

10. Музей землязнаўства // Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://bsu.by/by/structure/faculties/kafedry/muzey-zemlevedeniya-d. – Дата доступу: 11.02.2021.

11. Музей лыж // Звязда. – 1940. – № 294 (21 снеж.). – С. 4.

12. Музей правазнаўства // Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://bsu.by/by/structure/faculties/kafedry/muzey-pravovedeniya-d. – Дата доступу: 11.02.2021.

13. НАРБ. – Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1041. Л. 53.

14. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 29. Л. 3 зв.

15. Об утверждении Типового положения о музее высшего учебного заведения / Приказ Минвуза СССР от 05.11.1984 № 725 // Справочно-правовая система – Контур. Норматив [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://normativ.kontur.ru/document?moduleId=1&documentId=265566. – Дата доступа: 25.02.2021.

16. Основные показатели образования // Национальный статистический комитет Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/solialnaya-sfera/obrazovanie/. – Дата доступа: 10.03.2021.

17. *Патрушева, Г. М.* Музеи высших учебных заведений г. Омска и реализация ими образовательно-воспитательной функции на современном этапе / Г. М. Патрушева, О. О. Черникова // Академические и вузовские музеи: роль и место в научно-образовательном процессе: Матер. Всерос. науч. конф. с междунар. участием. Томск, 7–10 декабря 2008 г. / Отв. ред. Э. И. Черняк. – Томск: Изд-во Том. ун-та, 2009. – 336 с.

18. UMAC // Official site ICOM Russia [Electronic resource]. – Mode of access: http://icom-russia.com/data/mezhdunarodnye-komitety/umac/. – Date of access: 18.02.2021.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 01.02.2021.*